7 *Корзун, М.С.* Русская православная церковь. 1917–1945 / М.С. Корзун. – Минск, 1987.

8 *Кривова, Н.А.* Власть и церковь в 1922–1925 гг. / Н.А. Кривова. – М., 1997.

9 *Одинцов, М.И.* Государство и церковь / М.И. Одинцов. – М. : Академкнига, 1994.

10 *Левина, Н.Б.* Повседневная жизнь советского города: Нормы и аномалии. 1920–1930-е гг. / Н.Б. Левина. – СПб., 1999.

11 *Максименков, Л.* Сумбур вместо музыки. Сталинская культурная революция. 1936–1938. – М., 1997.

12 Гомельская епархия Белорусской православной церкви [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://eparhiya.by/. – Дата доступа : 14.11.2016.

13 Памяць. Гомель. Т. 1. – Мінск: БелТА. 1998.

14 *Пригодич, Н.* Воскрешение / Н. Пригодич // Гомельская праўда. – 2005. – 27 окт.

15 Православие на Гомельщине: историко-культурное наследие и современность : сб. науч. статей / ред. кол.: Г. А. Алексейченко [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2010.

16 Православие и современность. – М. : Художественная литература, 1988.

17 *Рогинский, Р.М.* Старообрядчество Гомельщины и советская власть. 1920–1930-е годы / Р.М. Рогинский // Русская православная церковь и коммунистическое государство. 1917–1941 г. Документы и фотоматериалы. – М. : Академкнига, 1996.

18 Старообрядчество: история, культура, современность: материалы X Междунар. конф. Москва-Боровск, 15–17 нояб. 2011 г. Т. 1. – М. : Боровск, 2011.

19 *Шишкин, В.А.* Власть. Политика. Экономика: Послереволюционная Россия (1917–1928) / В.А. Шишкин. – СПб., 1997.

УДК 385.81

## БЕЛАРУСКІ ЭТНАЦЫД

*П.М. БАТУРА*
*Установа адукацыі*
*«Беларускі гандлёва-эканамічны універсітэт спажывецкай кааперацыі»,*
*г. Гомель*

Якой бы цяжкай праўда ні была, але ж яна – праўда. І яе трэба ведаць. Размова пойдзе аб лёсах беларусаў. А ён на працягу гісторыі быў незайздросны. І не будзем сёння асацыіраваць сучаснае становішча і адносіны паміж цяперашнімі краінамі-суседзямі. На самай справе гісторыя была іншай. Савецкая гісторыяграфія замоўчвала цьмяныя плямы гісторыі нашай краіны. Не толькі ў савецкі час этнічная тэрыторыя рассялення беларусаў неаднаразова перакройвалася. А да вытокаў трэба імкнуцца, таму што праўда з розных бакоў бывае сваёю. А дзе ж існасць? Гістарычна склалася так, што беларусы падзяліліся на праваслаўных і каталікоў. Пазней з’явіліся так званыя ерэсі на целе Хрыстовым.

Не будзем далёка залазіць у гісторыю, але ж крышачку яе трэба прыпомніць. Так, да цяперашняга часу не сціхаюць спрэчкі аб паходжанні беларусаў, назве "Белая Русь", рассяленні і колькасьці беларусаў у розныя гістарычныя эпохі. Лічыцца, што ўжыванне тэрміну "Белая Русь" пачынаецца з часоў паходу цара Аляксея Міхайлавіча ў 1654 годзе на літоўцаў, дзе былі значныя перамогі. А гэта ж, лічы, сярэдзіна XVII стагоддзя... Што ж за людзі жылі на гэтых тэрыторыях?

У гісторыі здарылася так, што славянскія плямёны сучаснай Беларусі так і не стварылі трывалай дзяржавы за выключэннем Полацкага, Чарнігаўскага княстваў. Але ж яны былі нядоўгатэрміновымі, праваслаўнымі. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага ўключыла беларускія землі ў склад гэтай дзяржавы. Цікава, як магла стварыцца дзяржава, не маючы сваёй азбукі, мовы? Вядома, што ў ВКЛ дзяржаўнаю моваю лічылася беларуская, дзе назва "беларусы" нават і не ўпаміналася. А Статут (Канстытуцыя) ВКЛ лічыцца першым у свеце дэмакратычным канстуцыятыўным актам. На практыцы цалкам ён так і не паспеў ажыццявіцца.

Стварэнне Рэчы Паспалітай "прыбрала" ўсе беларускія землі і паклала пачатак першай паланізацыі беларусаў з насаджэннем каталіцызму пад сцягам уніяцкай царквы. Шмат польскага семя ўлілося па розных прычынах у прыгожыя целы беларускіх дзяўчат. Патомкі іх адследжваюцца і сёння не толькі па прозвішчах, характару і прыгажосці…

Пры трох падзелах Рэчы Паспалітай беларускія землі адыходзяць у склад Расійскай імперыі. Пачынаецца працэс русіфікацыі беларусаў пры ўсялякіх налогавых ільготах у першыя дзесяцігоддзі пражывання. Як пісаў Карамзін: «Літва, Волынь хотят возстановленія королевства польскаго, а мы желаем единства государства россійскаго». Для Карамзіна так і засталося, што пасля Смаленску пачынаецца Польшча. А пра беларусаў ні слова.

Але ж пры ўсёй цікавасці да гісторыі нас інтрыгуюць колькасць і рассяленне беларусаў на падмурку пісьмовых гістарычных крыніц.

Вялікую цікавасць выклікае прамова, агучаная 26 верасня 1910 года на паседжанні Віцебскай Вучонай Архіўнай Камісіі аб становішчы беларусаў. Гэта прамова прафесара Карскага амаль цалкам была надрукавана ў тым жа 1910 годзе пад аўтарствам Аляксея Сапунова пры назве "Белоруссія і белоруссы", дзе аўтар скардзіцца на нашых суседзяў: «палякі нас лічаць часткаю польскай нации, летувисы и латыши называют нас славянизированными литовцами, а для русских мы – поляки» [1]. Далей у прамове самае цікавае: «Перейдем теперь к подсчету белоруссов. К 1903 году белоруссов было около 8,5 миллионов (8.317.900). Цифра эта представляет лишь минимум; следовательно, в настоящее время мы смело можем поднять эту цифру, по крайней мере, до 9 миллионов» [1]. Для параўнання адзначым, што ў 1910 годзе вялікаросаў было 55,6 мільёнаў, а цяпер каля 140 (рост амаль у тры разы), украінцаў было 22 мільёны – цяпер каля 50 (рост амаль у 2,5 разы),

палякаў было 7,9 млн, цяпер 45 (выраслі ў 5 разоў, улічваючы зварот польскіх зямель з Германіі і Аўстра-Венгрыі), літоўцаў і жэмайтаў было 1,2 і 0,45 мільёнаў (цяпер летувісаў Рэспублікі Летува каля 3 мільёнаў). Рост у два разы. А пра беларусаў зноў ні слова… Але ж звернемся да вытокаў.

Згодна даследванням прафесара Карскага, «губернии по количеству в них белорусскаго населения идут в нижеследующем порядке: Минская – 755.669, Могилевская – 1.650.069, Виленская – 1.076.435, Витебская – 976.638, Смоленская – 947.826, Гродненская – 861.640, Черниговская – 700.000, Тверская – 125.000, Ковенская – 60.000, Псковская – 42.400, Калужская – 41.029, Орловская – 38.481, Сувалкская – 22.890, Курляндская – 20.981» [1]. Атрымоўваецца, што на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Летува, улічваючы Віленскую, Ковенскую і Сувальскую губерні, пражывалі 1 159 325 беларусаў. Дарэчы, у 1910 годзе беларусы там складалі 70 % насельніцтва. А ў 1959-м, як і цяпер, толькі 1,1 %, не ўлічваючы ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Куды ж дзеліся 1 мільён 130 тысяч беларусаў? Эпідэмій воспы, халеры, тыфу, а пазней «шпанкі» не было, хоць людзі і паміралі ад гэтых хвароб. Высяліць на цягніках ў тыя часы фізічна не маглі. Ды і невома куды. Гэта генацыд ці этнацыд? Вельмі цікава, што ўжо ў 1918 годзе правадыр сусветнага пралетарыяту У.І. Ленін, будучы кіраўніком РСФСР, бачыў у жамойтах-летувінах галоўнага памочніка ў барацьбе з «беларускім сепаратызмам» і польскім уплывам, таму што дывізіі беларусаў-каталікоў ваявалі супраць Летувы, вызвалілі Віленшчыну ад летувіскай акупацыі, дзе ў 1920 годзе была ўжо створана дзяржава Сярэдзінная Літва з сталіцаю ў г. Вільна. Ленін абяцаў летувінам не толькі Віленшчыну, а і ўсю Заходнюю Беларусь (Паўночна-Заходні край) з Заходняю Украінаю. Які ж ён быў нягоднік, не ўзіраючы на ваенна-палітычныя абставіны. Абяцаў пераймянаваць Гродна ў Гардзінас і г.д. Аддаў частку Расійскай імперыі дзеля збераджэння Савецкай улады. І для яго беларусы былі ніхто. У далейшым Масква перадала Віленшчыну не толькі з складу СССР і БССР замежнай дзяржаве. Беластоцкая губерня аказалася ў складзе Польшчы. А Молатаў нават у газеце «Праўда» прызнаў, што гэты край лічыцца этнічна беларускім. Летувісы прымусова мянялі нават прозвішчы беларусаў на жмудскі манер, забаранялі родную мову і г.д. Імкнуліся асіміляваць. Ды і цяпер у Рэспубліцы Летува забараняецца ўзнімаць гэту тэму, дзе пасля рэсцітуцыі 1991 года пачалося вяртанне ўласнасці толькі летувінам. Аднак і сёння ў Летуве, як і ў 1959-м жывуць толькі каля 30 тысяч беларусаў. А дзе ж дзеліся 2 мільёны? Асіміляваны?

А цяпер паглядзім на тэрыторыю Расіі. Па таму ж Карскаму, ў 1903 годзе ў Смаленскай губерні пражывалі 947 826 беларусаў, у Чарнігаўскай – 700 000, у Цверскай – 125 000, у Пскоўскай – 42 400, Калужскай – 41 029, Арлоўскай – 38 481 [2]. Амаль 2 мільёны. Для прыкладу возьмем Смаленскую губерню. У 1859 годзе Цэнтральны статыстычны камітэт царскай Расіі

праводзіў збор дадзеных аб жыхарах, якія былі надрукаваны ў Санкт-Пецярбургу ў 1869 годзе. Дык вось, большую частку насельніцтва складалі беларусы – 537 149 чалавек пры 487 930 вялікаросаў. Пры гэтым сам Смаленск з заходнімі ўездамі зусім былі беларускімі, дзе жылі 82 636 беларусаў і толькі 7611 вялікаросаў, 1077 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў [3]. Па сучаснай статыстыцы Расійскай Федэрацыі ў Смаленскай вобласці пражываюць ужо 93,4 % рускіх і толькі 1,55 % беларусаў. Куды ж дзеўся мільён беларусаў? Адказ трохі дае трэцяя лінейка ў дадзеных статыстычнага камітэту царскай Расіі 1859 году. Аказваецца, што па першай лінейцы – «великороссияне» значылася 487 930 жыхароў, а па другой – «белорусы» – 537 149 чалавек, трэцюю складалі «смесь великороссиян и белоруссов» – 121 407 чалавек. Сумненне выклікае трэцяя лінейка (графа), куды ўваходзілі яшчэ не зусім асіміляваныя беларусы ці расіяне [1]. Але хочацца адзначыць, што ў так званым «перапісу» ўжывалася слова «беларус», хоць афіцыйнай назвы нашага народу яшчэ не было. «Палешукі мы, а не чалавекі». Як пісаў вядомы беларускі паэт Я. Купала: «…А чаго ж, чаго захацелася ім? <…> Людзьмі звацца» [4]. Беларуская інтэлігенцыя, пазней рэвалюцыянеры, ўсё гучней і гучней уздымалі «беларускае пытанне».

Звяртаючыся да так званага перапісу, царскія ўлады Расійскай імперыі сваім чыноўнікам прапанавалі пры першай магчымасці запісваць беларусаў у «этнас великороссиян». Вось каментарыі чыноўнікам: «В этнографическом отношении Смоленская губерния может быть разделена на две неравные части: восточную, с населением великорусского племени и западную, заселенную белорусами. Границу их раздела можно представить полосою, идущей от границы Псковской губернии через западную часть Бельского уезда, восточной части Пореченского и Духовиченского уездов, западную Вяземского, северо-восточную и восточную Дорогобужского, юго-западную Ельницкого, так что великорусское племя занимает уезды: Гжатский, Сычевский, большую часть Бельского и почти весь Вяземский и Юхновский… Население же граничной полосы носит на себе характер переходный от белорусского племени к великорусскому. Место смешанного населения обеих сторон нельзя впрочем, говоря вообще, ограничивать только ограниченною граничною полосою; более или менее резкие оттенки того и другого племени проявляются на гораздо большем пространстве…» [2]. Памер артыкулу не дазваляе разгледзець становішча беларусаў у іншых губернях Расійкай імперыі і Савецкай дзяржавы. А яно было схожым. Якія ж яны былі разумнікі, што і ў той час так раскладвалі «па полках» лёсы страдальнага народу! Дык дзе ж дзеліся тры мільёны беларусаў? Савецкая ўлада таксама рэзала-пераразала нашу тэрыторыю. За кошт яе «падрасла» і Расія. А Літоўская ССР утварылася лічы на беларускіх землях. Беласточчыну Сталін аддаў палякам. Чаму мы былі такімі гарэтнымі? Не было ўласнай дзяржавы, якая б абараняла народ? Не было карысных выкапняў? А яны ж станавіліся з часоў

Сярэдневечча (ды не толькі) прычынаю шматлікіх войнаў, дзе нашая тэрыторыя была прамежжам паміж Заходняю Еўропаю і Расіяю. А можа балоцістая мясцовасць, не дазваляўшая аб’яднацца? Бездарожжа, камары ды вошы? Але народ наш жыў разам з хрысціянскаю царквою, якая заўсёды была з людзьмі. І ў радасці, і ў горы. Адзіная крэпасць, якую не ўзялі нават бальшавікі, была царква! Вера ў Бога ратавала і давала надзею. Тадышняя медыцына не ўсё магла лячыць, ды і малалікасць дахтароў ва ўмовах адлегласцей і бездарожжа не заўсёды былі спасальнымі. Звыш трох мільёнаў беларусаў былі беззваротна асіміляваны суседнімі этнасамі. Ні з адным суседнім народам пахожага не адбывалася. Спрэчкі аб лёсе беларусаў не сціхаюць і цяпер. Але беларусы ўсё-такі заявілі аб сабе пры Савецкай уладзе, калі на Новы 1919 год было абвешчана аб стварэнні беларускай дзяржавы. У часы Савецкай улады пакут не зменшылася. Былі вялікія дасягненні і выпрабаванні. Існаванне незалежнай дзяржавы цяпер дае надзею, што беларускі народ не згіне.

**Спіс літаратуры**


1 *Сапуноў, А.* Белоруссія і белорусы / А. Сапуноў. – М., 1910.

2 *Деружинский, В.* Исчезнувшие беларусы / В. Деружинский // Секретные исследования : Аналитическая газета. – 2015. – № 22 (351).

3 *Ширяев, Е.Е.* Беларусь: Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах / Е.Е. Ширяев. – Минск : Навука і тэхніка, 1991.

4 *Батура, П.М.* Политология. Хрестоматия / П.М. Батура, И.С. Котов, С.П. Батура. – Гомель, 2011.



УДК 271.2(476.2)


# ВОЗРОЖДЕНИЕ ЦЕРКОВНОЙ ЖИЗНИ НА РУБЕЖЕ XX–XXI СТОЛЕТИЙ НА ДОБРУШЧИНЕ


*А.М. ВДОВЕНКО, А.А. ТРАПША, Е.Л. ГУЦЕВА*

*Государственное учреждение образования*

*«Специализированный лицей при Университете гражданской защиты Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь»,*

*г. Гомель*


Начало XX столетия ознаменовалось расстрелом царской семьи и последующим целенаправленным уничтожением церковной жизни. Сталинские репрессии, военное лихолетье, подавление Православия коммунистической идеологией привело к тому, что церковная жизнь стала серой и незаметной. Несмотря на неблагоприятные условия и гонения церковная жизнь не умирала. Церковные обряды и таинства продолжали совершаться, но проводи-